Чтобы помнили



# ЗУБЕЦ
## Васіль Мартынавіч
### (да 110-годдзя з дня нараджэння)

*Пра яго жыццёвы і творчы шлях можна расказваць доўга і бясконца. Біяграфія Васіля Мартынавіча, што захапляючая кніга, гартаючы якую, на кожнай старонцы адкрываеш для сябе штосьці цікавае. Ён з кагорты тых людзей, хто стаяў ля вытокаў вялікай меліярацыі Беларусі, хто спрадвечныя мары земляроба дапамагаў увасобіць у канкрэтныя здзяйсненні. Усё, чаго дабіўся Зубец, дасягнута ўпартай настойлівай працай і мазалямі.*

*Перш чым стаць вядомым вучоным, Васіль Мартынавіч прайшоў вялікую жыццёвую школу.*

*Сын селяніна-бедняка з вёскі Гарадок Глускага раёна, ён яшчэ змалку зведаў усе цяжкасці працы хлебароба ва ўмовах празмернай забалочанасці і пераўвільгатнення.*

*«Гэтая акалічнасць у значнай меры і вырашыла выбар маёй будучай прафесіі»,– прызнаецца Васіль Мартынавіч.*

*Пасля заканчэння Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі яго накіравалі ў Грузію, дзе ў той час у шырокіх маштабах распачыналася меліярацыйнае і ірыгацыйнае будаўніцтва.*

*Спачатку быў радавым інжынерам, потым стаў начальнікам праектнага аддзела Калхідбуда. А неўзабаве новае павышэнне — намеснік дырэктара Калхідскай даследна- меліярацыйнай станцыі. «Талковы спецыяліст, удумлівы, разважлівы. Такі далека пойдзе», – казалі пра Зубца.*

*Кожная вясна прыносіла новыя радасці і надзеі. Расло майстэрства, набываліся тэарэтычныя веды, павышалася кваліфікцыя.*

*З яшчэ большай напорыстасцю і энтузіязмам узяўся Васіль Мартынавіч за справу, калі вяртаўся назад, у родную Беларусь. Малады, энергічны, ён ясна бачыў заўтрашнія гарызонты. Агортвала гарачае жаданне зрабіць нешта незвычайнае.*

*І раптам вайна. З першых да апошніх яе дзён Зубец знаходзіўся ў дзеючай арміі ў саставе Заходняга і Трэцяга Беларускага франтоў.*

*Аб тым, як мужна і самаахвярна змагаўся баец з ворагам, сведчаць высокія узнагароды: ордэны Айчыннай вайны І і ІІ ступеняў, Чырвонай Зоркі, медаль “За адвагу” і іншыя.*

*Калі змоўклі гарматы, і на зямлю прыйшоў доўгачаканы мір, яму сказалі: «Трэба працягваць ранейшую справу».*

*А пачынаць кіраўніку трэста «Белмеліяпраект» прыйшлося з нуля. Патрэбна было вырашыць цэлы шэраг праблем: стварыць належную матэрыяльна-тэхнічную базу, знайсці спецыялістаў, вызначыць патрэбы сельскай гаспадаркі ў праектна-каштарыснай дакументацыі. Так як вопытных кадраў не хапала, то асноўны цяжар лёг на яго плечы. Рана пачынаўся і позна канчаўся рабочы дзень Васіля Мартынавіча.*

*У поўную сілу праявіліся яго талент, арганізатарскія здольнасці крыху пазней, калі прызначылі дырэктарам Інстытута Белгіправодгас, потым – першым намеснікам міністра, а затым і міністрам меліярацыі і воднай гаспадаркі БССР. Пад кіраўніцтвам і пры непасрэдным удзеле Васіля Мартынавіча быў распрацаваны праект комплекснага асваення Палескай нізіны.*

*Вядома, было б памылкай сцвярджаць, што ўсе перамогі даваліся легка і проста. Не, цяжкасцей хапала, супярэчнасцей таксама. Аднак Зубец ніколі не баяўся першым зрабіць крок насустрач новаму, нязведана-*

*му. Рэаліст па натуры, ён на рэчы глядзеў прама, не абыходзячы вострых вуглоў. У ім была закладзена трывалая аснова высокай працавітасці, вялікага партыйнага сумлення і гонару.*

*Амаль 20 гадоў заслужены дзеяч навукі БССР Васіль Мартынавіч Зубец з'яўляўся дырэктарам Беларускага НДІ меліярацыі і воднай гаспадаркі. Многае значыць, калі кіраунік дасканала ведае справу. Гэта ўзвышае яго ў вачах падначаленых, выклікае да яго павагу і сімпатыю. Такі кіраўнік сілай асабістага прыкладу аказвае чароўнае ўздзеянне.*

*Васіль Мартынавіч ніколі не аддзяляў сябе ад калектыву, не ўставаў над ім, нічога не ставіў вышэй за яго давер'е і павагу, таму і карыстаўся сярод супрацоўнікаў Істытута ўсеагульным аўтарытэтам.*

*Усе мы па-добраму зайздросцілі яго жыццярадаснасці, уменню знаходзіць агульную мову з людзьмі, займацца з аспірантамі. Чалавек слова, шчодрай душэўнай дабрыні, ён многіх паставіў на ногі. У Зубца шмат паслядоўнікаў. Абараніўшы кандыдацкія, а то і доктарскія дысертацыі, яны, калі ўзнікала неабходнасць, у першую чаргу ішлі за добрым словам, разумнай парадай да свайго настаўніка.*

*Расказ не будзе поўным, калі не ўказаць, што за вынаходніцтвы ў галіне меліярацыі Зубцу выдадзена 10 аўтарскіх пасведчанняў. Да ўзнагарод, атрыманых за ратныя подзвігі, прыбавіліся ордэны Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Працоўнага Чырвонага Сцяга, Дружбы народаў.*

*Асаблівы гонар доктара тэхнічных навук Зубца – залаты медаль імя А. Н. Касцякова, якога ён удастоены за асаблівы ўклад у развіццё меліярацыі.*

*А колькі апублікавана навуковых работ! Многія з іх з'яуляюцца навуковымі дапаможнікамі для тых, хто звязаў свой лёс з пераўтварэннем зямлі.*

*Сваей нястомнай працай і актыўнай навуковай дзейнасцю Васіль Мартынавіч здабыў шырокую папулярнасць і павагу сярод вучоных і спецыялістаў нашай краіны і за яе межамі. Ён вядомы як буйны вучоны ў галіне асушальных меліярацый. Распрацаваныя ім навуковыя асновы кіравання водным рэжымам і эксплуатацыі асушальных сістэм атрымалі шырокае прымяненне ў сельскагаспадарчай вытворчасці.*

*Светлая памаць аб выдатным беларускім вучоным у галіне меліяраціі назаўседы застанецца ў нашых сэрцах.*

**Яўген Канаплеў, памочнік кіраўніка**
**РУП «Інстытут меліярацыі»**



## МУРАШКО
### Анатолий Иванович
### (к 90-летию со дня рождения)

*Родился 29 апреля 1927 года в городе Березино Минской области. В 1955 г. Анатолий Иванович с отличием закончил гидротехнический факультет Белорусского политехнического института. Перед поступлением в институт служил в рядах Советской Армии (1944-1951). Работал ассистентом кафедры строительной механики БПИ (1955-1957), учился в аспирантуре Белорусского НИИ мелиорации и водного хозяйства (1957-1960), затем работал в институте младшим (1961-1962) и старшим научным сотрудником (1962-1966). С 1966 по 1983 г. заведующий лабораторией, с 1983 года директор Центрального научно-исследовательского института комплексного использования водных ресурсов (ЦНИИКИВР), академик-секретарь Западного отделения ВАСХНИЛ (1983-1986).*

*Кандидат (1961), доктор технических наук (1972), профессор (1974), академик ВАСХНИЛ (1982), заслуженный деятель науки и техники БССР (1974). Анатолий Иванович Мурашко опубликовал более 250 научных работ, в том числе 8 монографий.*

*За время работы в БелНИИМиВХ им была проведена большая научно-исследовательская, опытно-конструкторская и организационная работа по созданию и широкому внедрению новых принципов, методов и способов мелиораций сельскохозяйственных угодий, применению полимерных и других новых материалов в мелиоративных системах двустороннего действия. Оригинальность и новизна разработок подтверждены десятью авторскими свидетельствами на изобретения.*

*Член экспертного совета ВАК СССР по гидротехнике и мелиорации. Анатолий Иванович большое внимание уделял подготовке научных кадров: под его руководством защищены 17 кандидатских диссертаций.*

*Активное участие принимал А.И.Мурашко в работе НТС Минводхоза СССР и БССР, редколлегии журнала «Гидротехника и мелиорация», межведомственного Совета по мелиорации при Совете Министров БССР, бюро секции по полимерным материалам ГКНТ СССР.*

*Вклад Анатолия Ивановича в развитие мелиоративной науки отмечен орденом Трудового Красного Знамени, многими медалями, Золотой медалью им. А.Н. Костякова, золотой и серебряными медалями ВДНХ СССР, Почетными грамотами Совета Министров СССР, Минводхоза СССР и БССР, Главполесьеводстроя, БелНИИМиВХ.*



## ВЕРЕНИЧ

### Андрей Федорович

### (к 70-летию со дня рождения)

*Родился 26 апреля 1947 г. в д. Стахово Столинского района Брестской области. В 1978 г. закончил агрономический факультет Гродненского сельскохозяйственного института.*

*Трудовую деятельность начал в 1966 г. электрослесарем шахты «Южная-1» в Ростовской области. В 1966-1969 гг. служил в Советской Армии, в 1970-1973 гг. работал агрономом колхоза «Октябрьская революция» Каменецкого района. С 1973 г. трудился в Полесском комплексном отделе Белорусского НИИ мелиорации и водного хозяйства старшим техником, старшим агрономом, младшим, старшим научным сотрудником лаборатории пойменных сенокосов и пастбищ; в 1994-2006 гг. – заведующий отделом пойменного луговодства Института мелиорации и луговодства, в 2006-2015 гг. – ведущий научный сотрудник лаборатории сенокосов и пастбищ на мелиорированных землях.*

*Кандидат сельскохозяйственных наук (1988), доцент (2004). Автор около 90 опубликованных научных работ по вопросам луговодства, сельскохозяйственного использования осушенных земель и экологии, многочисленных рекомендаций производству по луговому кормопроизводству.*

*Андрей Федорович – известный исследователь в области пойменного луговодства, земледелия на осушенных землях, сельскохозяйственной экологии. Большое внимание он уделял изучению взаимосвязи в системе «почва – растение – корма – животное – животноводческая продукция», активно работал по подготовке практических рекомендаций для районов Полесья по оптимизации сельскохозяйственного использования осушенных земель.*

*Научную работу А.Ф. Веренич успешно сочетал с педагогической, работая в течение ряда лет в Полесском Государственном университете.*

*Уроженец Полесья, выходец из крестьянской семьи Андрей Федорович Веренич всю свою трудовую жизнь стремился к процветанию прекрасного Полесского края.*